

■ ПраСПОРТ

# Помнім пра Капітана

## НА «МІНСК-АРЭНЕ» ПРОЙДЗЕ ЧАРГОВЫ ТУРНІР ПАМЯЦІ РУСЛАНА САЛЕЯ

**Цяпер ён стане ўжо трэцім па ліку. Па традыцыі ў Мінску сустрэнуцца дзве каманды з кантынентальнай хакейнай лігі (сёлета гэта будуць наша «Дынама» і дэбютант, хакейны клуб «Сочы»), а таксама пераможца апошняга чэмпіянату краіны гродзенскі «Нёман» і зборная клубаў Беларусі.**

Турнір пройдзе з 15 па 17 жніўня па кругавой сістэме: за тры дні каманды правядуць матчы адна супраць адной па прынцыпе «кожная з кожнай».

Каманду клубаў Беларусі ўзначаліць Міхаіл Захараў. Ён сабраў 23 хакеісты, сярод якіх гульцы «Юнацтва», «Гомеля», «Металурга», «Шахцёра» і «Хіміка-СКА». Для «Дынама» і «Сочы» турнір стане адным з апошніх кантрольных стартаў перад пачаткам чарговага сезона КХЛ. А для беларускіх заўзятараў гэта выдатны шанц яшчэ да пачатку чэмпіянату ўбачыць новую сочынскую каманду.

Турнір, які мае адбыцца, не варта блытаць з Кубкам Руслана Салея, у які быў перайменаваны Кубак Беларусі (звычайна ён праходзіць з дваццатых дзён жніўня і заканчваецца 1 верасня).

**Расклад гульняў:**

**15.08.** «Нёман» — зборная клубаў Беларусі (15.00), «Дынама» (Мінск) — «Сочы» (19.00).

**16.08.** «Сочы» — зборная клубаў Беларусі (13.00), «Дынама» (Мінск) — «Нёман» (17.00).

**17.08.** «Нёман» — «Сочы» (13.00), «Дынама» (Мінск) — зборная клубаў Беларусі (17.00).

Турнір памяці Руслана Салея праводзіцца з 2012 года і прысвечаны вядомаму беларускаму хакеісту, які загінуў 7 верасня 2011-га ў авіякатастрофе пры вылеце з Яраслаўля ў Мінск. Пераможцам першага турніру стаў падмаскоўны «Віцязь», другога — хабараўскі «Амур». Усяго ў турніры прыняло ўдзел 8 камандаў — тры з чэмпіянату Беларусі і пяць — з КХЛ.

Штогод на турнір прыязджае і хто-небудзь з сям'і Руслана. Першае ўкіданне ў 2012 годзе правёў маленькі Сандра Салей.

— Ад імя нашай сям'і хачу падзякаваць за любоў і падтрымку, аказаныя нам, а таксама выказаць удзячнасць клубу «Дынама» і федэрацыі хакея Беларусі за арганізацыю такога турніру. Руслан любіў хакей, але больш за ўсё даражыў адносінамі ўнутры любой каманды, гонар якой ён абараняў. Ім ён аддаваў усе сілы. Яшчэ ён ганарыўся сваёй краінай. Яму падабалася жыць у ЗША, але яго сэрца, ведаю, заўсёды было тут, у Мінску, у Беларусі. Цяпер тут будзе і маё. Я таксама ганаруся тым, што з'яўляюся яго жонкай і маці нашых дзяцей (Руслан меў траіх дзяцей — **Аўт.**). Веру, што Руслан зараз глядзіць на нас і ганарыцца намі і Беларуссю, — заявіла ўдава хакеіста Бэтэн.

Руслан Салей — адзін з найлепшых гульцоў у гісторыі беларускага хакея, заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь. Ён правёў за зборную 66 гульняў, выступаў на васьмі чэмпіянатах свету і трох Алімпіядах (1998, 2002, 2010).

Выхаванец мінскай хакейнай школы СДЮШАР № 12, большую частку кар'еры ён правёў за акіянам. У рэгулярных сезонах НХЛ згуляў 917 матчаў, у якіх набраў 204 (45+159) ачкі. У розыгрышах Кубка Стэнлі 62 гульні і 16 (7+9) ачкоў. У 2003 годзе Руслан Салей першым з беларускіх хакеістаў дайшоў да фіналу Кубка Стэнлі. У гэтым годзе ён уведзены ў залу хакейнай славы ў Таронта. Беларуская федэрацыя хакея вывела з абарачэння ў зборнай 24-ы нумар, пад якім Салей гуляў у нацыянальнай камандзе.

**Глен ХЭНЛАН, экс-галоўны трэнер Нацыянальнай зборнай Беларусі па хакеі:** «Я памятаю, у 2009 годзе на чэмпіянаце свету ў адным з матчаў мы гулялі ў меншасці. Руслан не пакідаў лёду 2 хвіліны. Мы выстаялі і адразу атрымалі большасць. І ён мне сказаў: «Трэнер, выпускай мяне». Я сказаў: «Руслан, ты, напэўна, стаміўся, адпачні». А ён адказаў: «Я ніколі не стамляюся…»

**Яўген ВОРСІН, старшыня Федэрацыі хакея Беларусі:** «Гэты чалавек мог прапанаваць трэнеру пакуль не ўмешвацца ў падзеі, якія адбываюцца на лёдзе. Ён сам збіраў гэтую каманду і казаў ёй, мабыць, самыя патрэбныя словы. Пасля перапынку гэта выходзіла зусім іншая каманда, гатовая змагацца, гатовая перамагаць. Гэта роля лідара, роля капітана каманды».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# БАТЭ ЗНОЎ НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ

**Барысаўскі БАТЭ ў перанесеным матчы 19-га тура ў Мінску перамог мясцовае «Дынама» — 2:0. З кожным турам інтрыга ў нашым першынстве толькі ўзрастае.**





Супрацьстаянне барысаўчан і дынамаўцаў ужо паспелі ахрысціць нашым «класіка» па аналогіі з футбольнымі матчамі паміж іспанскімі грандамі «Барселонай» і мадрыдскім «Рэалам». І сапраўды, сустрэчы БАТЭ і «Дынама» вылучаюцца бескампраміснай барацьбой на полі. Сёлета «разыначку» дадае і тое, што «блакітна-белыя» складаюць камандзе Аляксандра Ермаковіча выразную канкурэнцыю ў барацьбе за залатыя медалі і да гэтай гульні займалі першы радок у турнірнай табліцы.

Пакуль не вельмі ўпэўненая хада па дыстанцыі нашага чэмпіёна для многіх аўтаматычна фаварытам паядынку рабіла менавіта сталічную дружыну. Аднак на вачах сямітысячнай аўдыторыі БАТЭ прадэманстраваў выдатную канцэнтрацыю і рэалізацыю галявых момантаў. З трыбун і сапраўды падалося, што для «жоўта-блакітных» гэта пакуль самы лепшы матч у чэмпіянаце: госці не проста стрымалі атакі гаспадароў, а двума трапнымі ўдарамі Міхаіла Гардзейчука і Ільы Алексіевіча знішчылі інтрыгу ў сустрэчы. А вось «Дынама» так і не здолела адказаць саперніку адэкватна. У выніку што мы маем? Упэўненую перамогу БАТЭ, якое пакуль выйшла на першы радок турнірнай табліцы (у «Дынама» яшчэ адна гульня ў запасе са «Слуцкам») і, безумоўна, добры эмацыйны фон, з якім каманда паступова падыходзіць да першага матча плэй-оф Лігі чэмпіёнаў з браціслаўскім «Слованам».

— Турнірная табліца не пакідала нам другой магчымасці, акрамя таго, як перамагаць, — зазначыў пасля сустрэчы **Аляксандр ЕРМАКОВІЧ, галоўны трэнер БАТЭ.** — А таму мы вельмі рады перамозе. Пасля перапынку нам дзейнічаць было прасцей. Маглі забіць яшчэ, але не здолелі. Удзячны хлопцам за тое, што ў шчыльным графіку яны трываюць і перамагаюць у важных матчах.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
**Фота аўтара.**

# БЕЛЬГІЙЦЫ НЕ ПА ЗУБАХ

## НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БАСКЕТБОЛЬНАЯ ЗБОРНАЯ САСТУПІЛА НА ВЫЕЗДЗЕ КАМАНДЗЕ БЕЛЬГІІ

**Нашы баскетбалісты працягваюць барацьбу ў кваліфікацыі чэмпіянату Еўропы-2015. Пасля хатняй перамогі над датчанамі яны адправіліся ў Бельгію да фаварытаў групы D.**

Паездка гэтая не абяцала быць лёгкай, гэта стала зразумела ўжо ў дзень вылету. Цэлы шэраг форс-мажорных сітуацый прыйшлося перанесці беларусам, перш чым яны дабраліся да пункта прызначэння — горада Шарлеруа. Рэйс, на якім павінна была ляцець каманда, адмянілі з-за няспраўнасці самалёта. У выніку — 6 гадзін чакання замены рэйсу ў нацыянальным аэрапорце і пералёт Мінск — Прага — Вена — Брусэль. Нарэшце, прыбылі ў бельгійскую сталіцу, але трансферны аўтобус з беларускай зборнай яшчэ каля паўгадзіны не мог пакінуць тэрыторыю аэрапорта па прычыне ДТЗ, якое перагарадзіла выезд у горад. З-за таго, што дарога парадкам зацягнулася, гульцы прыбылі ў гасцініцу значна пазней.

Зборная Бельгіі першапачаткова лічылася намінальным фаварытам у нашай групе, аднак пасля пройгрышу македонцам у першай гульні бельгійцы не здаваліся такімі грознымі.

Душан Гвоздзіч прывёз у Шарлеруа тых жа 12 баскетбалістаў, што гулялі ў мінулую нядзелю ў Мінску. Змены адбыліся толькі ў стартавай пяцёрцы: замест Аляксандра Пустагвара на пляцоўку выйшаў Віталь Лютыч. Пасля даволі роўнага пачатку беларусы аддалі перавагу бельгійцам, пасыпаліся памылкі, нашы хлопцы не траплялі ў кольца і рабілі страты, нядрэнна гуляючы толькі на падборы. Не казалі сваіх слоў і лідары каманды Аляксандр Пустагвар і Аляксандр Кудраўцаў. Пасля дзвюх чвэрцяў беларусы прайгравалі 5 ачкоў, далей адрыў стаў расці, і падапечныя Гвоздзіча да канца гульні так і не змаглі нічога супрацьпаставіць гаспадарам, прайграўшы 71:57. Наступная гульня зборнай Беларусі пройдзе 17 жніўня ў Мінску — з камандай Македоніі.

У гэты час праходзіў яшчэ адзін паядынак у нашай групе: зборная Даніі прайграла Македоніі 75:81, такім чынам у датчанаў ужо два паражэнні, у беларусаў і бельгійцаў па адным. Працягвае здзіўляць і зборная Расіі. Баскетбалісты Яўгена Пашуціна прайграюць другую гульню запар. На гэты раз, выйграючы 10 ачкоў, расіяне ўсё ж саступілі італьянцам 63:65.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# АНДРЭЙ КРАЎЧАНКА СТАЎ ЧЭМПІЁНАМ ЕЎРОПЫ Ў ДЗЕСЯЦІБОР'І

**Андрэй Краўчанка заваяваў позна ўвечары 13 жніўня залатую ўзнагароду ў дзесяцібор'і на чэмпіянаце Еўропы-2014 па лёгкай атлетыцы, які праходзіць у швейцарскім Цюрыху. Ён стаў першым медалістам турніру сярод прадстаўнікоў Беларусі.**

Пераможная сума Андрэя Краўчанкі склала 8616 ачкоў і аказалася ўсяго на адно ачко меншай, чым яго асабісты рэкорд. Па выніках спаборніцтваў беларус на 95 ачкоў апярэдзіў сярэбранага прызёра француза Кевіна Маера (8521). Бронзавая ўзнагарода дзесяцібор'я дасталася расіяніну Ілью Шкуранёву (8498). Нямецкі шматборац Кай Казмірак, які доўга лідзіраваў у спаборніцтвах, у апошніх відах праграмы не ўтрымаў свае пазіцыі і аказаўся на выніковым 6-м месцы.

**З заваяваннем залатога медаля на чэмпіянаце Еўропы па лёгкай атлетыцы Андрэя Краўчанку павіншаваў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы. «Лідарства сярод эліты дзесяцiборцаў — не выпадковая ўдача, а вынік велізарнай самаадданай працы і мэтанакіраванасці ў дасягненні поспеху», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка**



# ГІМН МЁДУ

**Па гарызанталі: 1.** У Беларусі пчолы, як гусі, рэзгінямі ... носяць (прык.). **3.** Сельскагаспадарчая прылада для зграбання сена, саломы. **9.** Рака, правы прыток Прыпяці. **10**. Салодкі мёд, ды не па дзве лыжкі ў ... (прык.). **11**. Арганізацыя, структура і стан гаспадарчага жыцця. **12**. «Гай цвітучы або ... ў цвеце -\\Для пчалы найлепшы дар на свеце». З вершаванай легенды В. Гардзея «Адкуль мядзведзь?». **14**. З воч ... сыплюцца, а з языка мёд цячэ (прык.). **15**. ... рабое (прым.). **19**. «А патрывожаныя пчолы\\Спяваюць хорам, як ...,\\Але кусаюць па-чартоўску». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля». («Падгляд пчол»). **20**. Вулей у дупле або ў выдзеўбанай калодзе. **21**. «Гула пчолка, гула,\\Па бару лятаючы,\\... сабіраючы». З беларускай народнай песні «Гула пчолка, гула». **22**. Адтуліна ў вуллі для вылету пчол. **24**. Лугавая птушка; тое, што і дзяркач. **25**. «Недзе ... ціха струны наладжвае,\\Звон падала свой пчала, пралятаючы». З верша М. Танка «Канцэрт у сене». **28**. За пчолкай — у мёд, за жукам — у ... (прык.). **32**. Горад на Магілёўшчыне, на гербе якога — выява пчалы. **33**. Горад у Расіі, сталіца Башкірыі, дзе ўсталяваны помнік пчале. **34**. Круглая пляцоўка. **35**. «... — з мёдам,\\З пшаніцаю — жнівень». З верша П. Панчанкі «Родная мова». **36**. «Сваячка» пчалы.

**Па вертыкалі: 1.** Пчаліная ...; самая буйная пчала, якая выводзіць пчалінае патомства. **2.** У старажытнагрэчаскай міфалогіі бог вінаробства і вяселля. **4.** Прыстасаванне для сотаў у вуллі. **5.** Пасля Мядовага Спаса (14 жніўня) ... насустрач восені падскокам бяжыць (прык.). **6.** ... весяліць, ды ад яе галава баліць (прык.). **7.** Прылада для акурвання пчол дымам. **8.** «Пчолкі мёд нясуць да сот,\\... есць ды есць той мёд». З верша Я. Купалы «Бай». **13**. Кароткае падарожжа. **16**. Мужчынскі голас. **17**. ... дзёгцю псуе бочку мёду (прык.). **18**. Гарадскі пасёлак, чыгуначная станцыя паміж Полацкам і Віцебскам. **21**. Тое, што і медуніца; травяністая лекавая расліна, цудоўны меданос. **23**. Адвага або мёд п'е, або ... трэ (прык.). **26**. Мана, няпраўда. **27**. Жаданне, імкненне. **29**. Цыркавы артыст — комік. **30**. Адна ... мёду не наносіць (прык.). **31**. Дзе мёд, там і ... (прык.).

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** 1. Мёд. 3. Граблі. 9. Стыр. 10. Рот. 11. Эканоміка. 12. Ліпа. 14. Іскры. 15. Абое. 19. Анёлы. 20. Борць. 21. Мядок. 22. Лятак. 24. Драч. 25. Камар. 28. Гной. 32. Клімавічы. 33. Уфа. 34. Круг. 35. Ліпень. 36. Аса.

**Па вертыкалі:** 1. Матка. 2. Дыяніс. 4. Рамка. 5. Лета. 6. Гарэлка. 7. Дымар. 8. Трутень. 13. Паездка. 16. Барытон. 17. Лыжка. 18. Обаль. 21. Мядунка. 23. Кайданы. 26. Абман. 27. Ахвота. 29. Клоўн. 30. Пчала. 31. Мухі.

Даты | Падзеі | Людзі

**1771** год — нарадзіўся Вальтэр Скот, шатландскі пісьменнік. Заснавальнік еўрапейскага рамана новага тыпу. Да 1827 года ўсе творы Вальтэра Скота, нават тыя, якія пазней атрымалі сусветнае прызнанне, выходзілі без імя аўтара. Маючы слабое здароўе, пісьменнік, аднак, вызначаўся фенаменальнай працаздольнасцю. Звычайна ён друкаваў два раманы на год і некалькі больш дробных твораў. Раманы Скота прысвечаны гісторыі Вялікабрытаніі. Іх дзеляць на дзве асноўныя групы. Першая — пра Шатландыю перыяду грамадзянскай вайны, другая — пра Англію, пераважна сярэднявечную і XVI стагоддзя. Ацэньваючы творчасць Вальтэра Скота, варта сказаць, што яго раманы спрыялі з'яўленню прац многіх еўрапейскіх гісторыкаў першай паловы XIX стагоддзя. «Вальтэр Скот — вялікі талент, які не мае сабе роўных», — лічыў Іаган Гётэ.

**1831** год — нарадзіўся (вёска Селішча, цяпер Карэліцкі раён) Вінцэсь Аляксандравіч Каратынскі, беларускі і польскі паэт і публіцыст. Самавукам набываў адукацыю, бо бацька, былы прыгонны селянін, пайшоў з жыцця вельмі маладым. Апроч беларускай і польскай, валодаў рускай, чэшскай, французскай і нямецкай мовамі, ведаў і лаціну. Працаваў сакратаром у вядомага паэта Уладзіслава Сыракомлі. У 1862 годзе падарожнічаў па Беларусі з рускім пісьменнікам Мікалаем Лясковым. Літаратурную дзейнасць пачаў у 1856-м. Супрацоўнічаў з віленскімі і варшаўскімі перыядычнымі выданнямі, друкаваў у іх артыкулы пра Беларусь. Выдаў на польскай мове паэтычны зборнік «Чым хата багата, тым рада», паэму «Таміла», яму прыпісваюць ананімныя антыцарскія творы «Гутарка старога дзеда» і «Гутарка суседзяў». З беларускамоўных твораў захаваліся вершы «Уставайма, братцы, за дзела, за дзела», «Далі бог-то, Арцём…», «Туга на чужой старане». Пакінуў біяграфічныя нататкі пра А. Міцкевіча, гісторыка-краязнаўчыя нататкі пра Навагрудак і Навагрудчыну. Памёр у 1891 годзе.



**1944** год — 70 гадоў таму нарадзіўся (вёска Вуйвічы Пінскага раёна) Аляксандр Іванавіч Баброўнік, беларускі вучоны ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі, доктар тэхнічных навук (1999). У 1965 годзе скончыў БПІ. Аўтар навуковых прац па эксперыментальных і тэарэтычных даследаваннях рэжымаў машынна-трактарных агрэгатаў. Распрацаваў рэкамендацыі для прывадаў і сістэм адбору магутнасці сельскагаспадарчых машын і трактароў.

**Было сказана**

**Максім ТАНК, народны паэт Беларусі:**

*«Аслепшы, яшчэ можна з кульбакай дарогу дадому знайсці. Аглухшы, яшчэ будзеш чуць скрып дзвярэй сваёй хаты. Анямеўшы, з сябрамі бяседу вясці ва ўспамінах. Толькі страціўшы Радзіму, будзеш, як камень, сляпы, і глухі, і нямы».*

**НАРОДЖАНЫЯ 15 жніўня**

**Гэтых людзей вельмі часта можна ўбачыць на чале шматлікага сямейнага клана, дзелавой або грамадскай групы, і яны на самой справе адчуваюць сябе ўтульна, калі займаюць высокі грамадскі пост. Жанчыны гэтага дня акружаны пашанай і павагай, а мужчыны надзелены непераўзыдзеным упраўленчым талентам і пры гэтым валодаюць дастатковым тактам. Людзям гэтага дня цяжка кантраляваць свае эмоцыі, таму яны могуць нарабіць глупства, пра што пазней пашкадуюць. Яны адрозніваюцца сентыментальнасцю, любяць усялякія праяўленні захаплення і адданасці.**

■ Ваша здароўе

# ШКЛЯНКА КЕФІРУ Ў ДЗЕНЬ

## Яна падоўжыць вашу маладосць

**Хоць бы адна шклянка кефіру ці іншага кісламалочнага прадукту у дзень здольная затармазіць заўчаснае старэнне арганізма і падоўжыць маладосць, паведамілі БЕЛТА ў Рэспубліканскім цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.**

Таксама кісламалочныя прадукты насычаюць арганізм вітамінамі групы В, якіх тут значна больш, чым у суцэльным малацэ, і знішчаюць гніласную мікрафлору «зашлакаванага» кішэчніка.

З нагоды **Дня здаровага харчавання,** які адзначаецца сёння, медыкі дзеляцца і іншымі рэкамендацыямі. Так, не варта есці на ноч — сон будзе больш спакойным і паўнавартасным. У перапынках паміж асноўнымі прыёмамі ежы, асабліва доўгімі, пажадана перакусваць, напрыклад, яблыкам або арэшкамі. Інакш страўнік зоймецца самаперававарваннем і з'явіцца «воўчы апетыт».

Есці трэба павольна, старанна перажоўваючы ежу, — гэта дапаможа добра насыціцца. Піць ваду падчас ежы не варта, бо яна разбавіць страўнікавы сок і замарудзіць працэс стрававання. Вады можна выпіць перад ядой, яна «абудзіць» страўнік і прымусіць яго больш актыўна пераварваць ежу. Штодня трэба выпіваць да 2 л вады.

Ужыванне солі пажадана скараціць. У звычайных прадуктах харчавання яе цалкам дастаткова для падтрымання жыццядзейнасці арганізма. Садавіна і агародніна — не толькі пастаўшчыкі вітамінаў і мікраэлементаў, але і крыніцы складаных вугляводаў, якія засцерагаюць ад знясільвальнага дзеяння простых вугляводаў, якія змяшчаюцца ў цукры і цукерках. Перавагу лепш аддаваць мёду, а не цукру. У першым шмат фруктозы, на засваенне якой не патрабуецца інсулін, тым самым можна абараніць сябе ад магчымага развіцця цукровага дыябету.

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.47 | 20.39 | 14.52 |
| Віцебск — | 5.33 | 20.33 | 15.00 |
| Магілёў — | 5.37 | 20.30 | 14.53 |
| Гомель — | 5.39 | 20.21 | 14.42 |
| Гродна — | 6.03 | 20.54 | 14.51 |
| Брэст — | 6.08 | 20.50 | 14.42 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 17 жніўня. Месяц у сузор'і Цяльца.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Васіля, Нікадзіма, Платона, Сцяпана.*
***К.*** *УНЕБАЎЗЯЦЦЕ НАЙСВЯЦЕЙШАЙ ПАННЫ МАРЫІ.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Самае складанае ў адносінах — гэта забраць у жанчыны, якая спіць побач, сваю палову коўдры.

**Муж — жонцы:**
**— Мілая! Наколькі моцнай зрабіць табе каву?**
**— Настолькі, наколькі моцнае тваё каханне да мяне!**
**— Значыць, вады наогул не дадаваць? Так пажуеш?**

Вельмі сарамлівы хлопец запрасіў дзяўчыну на спатканне. Але нешта пайшло не так, і ён стаў вельмі сарамлівым мужчынам.




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.157. Індэкс 63850. Зак. № 3351.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 14 жніўня 2014 года.